# Яблычак

*Мікола Янчанка*

Ідзе па вуліцы хлопчык.
А я следам іду.
Хлопчык подскакам, подбегам.
Я таксама хутчэй пайшоў.
Хлопчык спявае сваю на хаду складзеную песеньку:

На галіне грушкі
Заспявалі птушкі —
Нам спяваюць,
Нас вітаюць
Птушкі-весялушкі.

І першым маім жаданнем было падхапіць гэтую песеньку, якая так адпавядала майму ранішняму настрою. Аднак перадумаў. Людзі скажуць: «Вось дзівак. А яшчэ дарослы чалавек».

А хлопчык спявае. Падскоквае. І не толькі спявае ды падскоквае…

Жанчына кошыкі на рынак на калёсіках вязе. Дапамагу, думаю.

А хлопчык ужо ўплёўся ў ручкі і так піхае калёсікі, што гаспадыня адстае.

Вось і паварот на рынак.

— Дзякую, дзетка! — гаворыць жанчына. — З горачкі калёсікі самі скоцяцца. А за работу вось табе, — яна адхінула на кошыку хусцінку і падала хлопчыку залацісты яблычак.

Хлопчык хацеў пакаштаваць яго, ды, відаць, парашыў болей пацешыцца. І прыпусціў далей, падкідваючы і ловячы на хаду залацісты яблычак.

Але раптам спыніўся: малы плача на ўсю вуліцу. У сад не хоча ісці. Маці не ведае, што з ім рабіць.

А хлопчык да малога:

— Паглядзі-ка, што ў мяне. Не бачыш?

Малы перастаў плакаць, выцер вочы.

— Цяпер бачыш? Яблычак! Ды які яблычак! Залацісты! На! Бяжы хутчэй у сад ды сябрам пакажы.

І куды слёзы дзеліся! Малы ўперадзе маці ў сад пабег.

І зноў подскакам, подбегам, са сваёй песенькай ідзе па вуліцы хлопчык.

# ПРЫКЛАДНЫ АПОВЕД

(1) На сённяшні ўрок пазакласнага чытання я з задавальненнем прачытаў невялікае апавяданне Міколы Янчанкі «Яблычак».

(2) Апавядальнікам падзей з’яўляецца сам аўтар. Галоўным героем — хлопчык, якому пісьменнік чамусьці не даў імя.

(3) Апавяданне пачынаецца з моманту назірання аўтара за падлеткам, які ішоў па вуліцы то падскокваючы, то падбягаючы. Спадабаўся хлопчык пісьменніку тым, што спяваў на хаду сваю вясёлук самастойна складзеную песеньку. Яна адпавядала і настрою аўтара.

Раптам на сваім шляху хлопчык сустрэў жанчыну з кошыкамі. Яна ішла на рынак. Падлетак вырашыў ёй дапамагчы. Жанчына пасля падзякавала свайму дапамагатаму і падаравала яму адзін залацість яблык.

(4)Самым запамінальным эпізодам з’яўляецца сустрэча хлопчыка з малым дзіцем і яго маці. Малое плакала на ўсю вуліцу: не хацела ісці ў дзіцянь сад. Маці ніяк не магла суцешыць сына. А галоўны герой звярнуўся да малога і падараваў яму свой залацісты яблык. Дзіця супакоілася, радаснае пабегла ў дзіцячы сад. Хацела, відаць, пахваліцца перад сваімі аднагрупнікамі такім прыгожым падарункам.

А хлопчык подскакам і подбегам рухаўся вуліцы далей.

(5)У кнізе, дзе было змешчана гэтае апавяданне, на жаль, адсутнічаюць ілюстрацыі. Але я, каб быў мастаком-ілюстратарам, абавязкова намаляваў бы буйным планам момант, як хлопчык падае заплаканаму малому вялікі прыгожы яблык. А той з усмешачкай бярэ яго ў свае ручкі. Побач з ім знаходзіцца яго мама.

(6)Твор Міколы Янчанкі мне дужа спадабаўся тым, што аўтар паказаў галоўнага героя нераўнадушным да чужых праблем. Лічу, што і нам варта павучыцца ў хлопчыка дапамагаць людзям, як старэйшым, так і меншым. Тады і нам нехта дапаможа.